Янка Купала і Якуб Колас вывелі нашу літаратуру за рамкі нацыянальнай абмежаванасці, узнялі яе на вышыню развітых літаратур свету, зрабілі яе здабыткам агульначалавечай культуры.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі Янка Купала і Якуб Колас актыўна ўключыліся ў літаратурнае і грамадскае жыццё маладой краіны. Сваёй творчасцю яны выявілі велічны дух народа, вызваленага ад царскага прыгнёту.

Яны ўслаўлялі народную прагу да нацыянальнага Адраджэння, да светлых парыванняў у будучыню сваёй шматпакутнай Зямлі. Яны свята верылі ў шчаслівую зорку вялікай Праўды і Любові да працоўнага чалавека, носьбіта самых найлепшых духоўных якасцяў у гістарычнай прасторы і часе.

Тое, што зроблена нашымі слаўнымі песнярамі, не падлягае ніякаму вымярэнню.

Пройдуць гады і стагоддзі. Бессмяротная спадчына Янкі Купалы і Якуба Коласа будзе жыць вечна, натхняць нашчадкаў на вялікія добрыя справы дзеля роднай Бацькаўшчыны.

**А.М. Канапелька**

УДК 882.6 (092)

**К.С. Карнялюк**

# Мастацкая прырода коласаўскай эпічнай сістэмы

Мастацкая прырода класічнай коласаўскай эпічнай сістэмы – адна з самых стрыжнявых праблем сучаснага літаратуразнаўства і коласазнаўства. Яна атрымала досыць глыбокае асвятленне ў манаграфіях даследчыкаў [1-5]. У артыкуле мы паспрабуем шмат у чым па-новаму раскрыць складаны і супярэчлівы працэс ліра-эпічнага напаўнення прозы, спасцігнуць мастацка-філасофскую глыбіню трылогіі Я. Коласа «На ростанях».

Пошукі патрэбнага сінтэзу лірыкі і эпасу, калі лірызм не механічна далучаецца да эпічнай плыні празаічнага твора ў форме лірычных адступленняў, а, «як хімічны састаў, цалкам насычае сабою апавяданне» (У. Дняпроў), былі распачаты беларускімі празаікамі ў жанры апавядання. Гэта ў пэўнай ступені аблегчыла работу раманістаў у 1920-я гады, хоць, зразумела, для рамана трэба было шукаць сваю раманную меру сінтэзу.

Трылогія Я. Коласа «На ростанях», не страчваючы сваёй арыентацыі на эпічнасць, адчувала цягу да больш поўнага самараскрыцця асобы, асобы Лабановіча, імкнулася пазбавіцца ад залішняга рацыяналізму. У празаіка мы назіраем само пераасэнсаванне паняццяў лірызму і эпічнасці. Лірычнае, з уласцівым яму суб'ектыўным спосабам адлюстравання рэчаіснасці, не адхіляе, а, наадварот, шукае шляхі, якія б звязалі яго з эпічнай манерай апавядання. Эпічнае ў сваю чаргу становіцца іншым, выяўляецца ў больш цэласным гістарызме, у імкненні да большай філасафічнасці, псіхалагізацыі, якія адкрывалі магчымасць падключэння да агульначалавечых праблем. У якасці яскравай асаблівасці пісьменніцкай манеры Я. Коласа адзначым і адзінства ў прозе суб'ектыўна-лірычнага ўзнаўлення рэчаіснасці і яе аб'ектыўна-аналітычнага асэнсавання. Даследчыкі творчасці празаіка ўсведамляюць, што непаўторнасць яго мастацкай сістэмы – у своеасаблівым сінтэзе лірычнага і

эпічнага спосабаў адлюстравання жыцця, яе драматычным напаўненні.

У лірызаванай трылогіі Лабановіч засяроджаны часта ў сябе, і пераважную большасць малюнкаў мінулага Я. Колас перадае ў форме ўспамінаў героя, выкліканых пэўнымі асацыяцыямі з сучаснасцю, што вядзе да максімальнага збліжэння розных пластоў часу. І таму асновай становіцца духоўнае адзінства Коласа і Лабановіча, а канфлікты твора закладзены нават у сферы ідэй (патрыятычнай, гуманістычнай, выхаваўчай і г.д.), якія ў сваю чаргу вызначаюць расстаноўку і характар узаемаадносін персанажаў.

В. Халізеў заўважыў: «У прыродзе эпасу – універсальна-шырокае выкарыстанне магчымасцяў мастацкай літаратуры як фармальных, так і змястоўных» [6]. А. Адамовіч адзначае, што Колас «у аднолькавай ступені лірык і эпік, філосаф і бытапісальнік, рамантык і па-народнаму мудры, практычны чалавек. Надзвычайная цэласнасць светаадчування, багацце пачуццяў – ад светлага да сурова-трагічнага, па-народнаму просты і цвярозы погляд на рэчы, пастаянная і, як у самога народа, зацятая варожасць да ўсяго, што перашкаджае працоўнаму чалавеку жыць у шчасці» [4, с. 9].

Многа месца і ўвагі адводзіцца ў трылогіі паказу жыцця сялянства, пісьменнік адносіцца да сваіх герояў з любоўю і павагай, але не ідэалізуе іх. Так, Я. Колас малюе цемнату і забітасць сялянства (спрэчкі жыхароў Цельшына аб дні святкавання ўводзін), яго неарганізаванасць у грамадскім жыцці (выбар старшыні ў в. Выганы). Сюжэт ускладняецца цэлым шэрагам апавяданняў, якія знаёмяць нас з гістарычным мінулым беларускага народа (апавяданні аб гвалтах шведскіх салдат), выкрываюць сутнасць афіцыйнай рэлігіі (замалёўкі богаслужэнства а.Мадэста і а.Мікалая). Аўтар на прыкладзе жыцця вёсак Цельшына, Высокае, Выганы, Мікуцічы, Верхань дае ўсебаковае ўяўленне аб цяжкім і бяспраўным існаванні беларускага працоўнага сялянства, аб умовах яго працы, асаблівасцях быту, культуры і г.д. Паказваючы ўзаемаадносіны працоўнага сялянства з панам Скірмунтам, папом Кірылам і многімі іншымі, Колас ускрывае прычыну класавага антаганізму ў тагачасным грамадстве. Лабановіч на прыкладзе жыцця і дзейнасці пісара Дулебы, старшыні валасці Захара Лемеша бачыў той «цёмны лес», які перашкаджаў селяніну не толькі шукаць праўды, але і думаць аб ёй.

Шматпланавая пабудова эпічнага твора ў тыя гады (пачатак XX ст.) была наватарскай для беларускай літаратуры, аднак Колас застаецца верны шматпланавасці ва ўсёй прозе. Перад намі мастак эпічнага складу, талент якога ўходзіць карэннямі ў глыбіні народнага жыцця. У яго творах атрымалі асвятленне важнейшыя падзеі, карэнныя зрухі, якія адбываліся ў сацыяльнай рэчаіснасці. Гэтым самым абазначаўся эпічны характар яго творчасці. Галоўнымі рысамі рэалізму Я. Коласа вызначым эпічную шырыню і звязанае з ёю адлюстраванне эпохі, якое перадае паўнату, канкрэтнасць і нагляднасць таго, што апісваецца; псіхалагічную насычанасць расказу, раскрыццё ўнутранага свету герояў. Аўтар эпічна спакойна, часам велічна, з усёй суровай праўдзівасцю даследуе жыццё ад самых узвышаных да самых яго будзённых праяўленняў. Трылогія – гэта сапраўдны эпічны твор, героем якога выступае беларускі народ у адзін з важнейшых пераломных перыядаў сваёй гісторыі.

Першая і ў некаторай ступені другая частка трылогіі аднаўляюць жыццё героя на тым этапе, калі ён блукае ў пошуках «ісціны», у пошуках сэнсу жыцця. Гэта абумовіла наяўнасць псіхалагічных сітуацый, якія хоць і пазбаўлены драматычнага дзеяння, з'яўляюцца, аднак, жыццёва праўдзівымі. А сама статычнасць кампазіцыі першай часткі змяняецца ў далейшым нарастаннем дзеяння, канфлікту. Само ж адрозненне поглядаў герояў, супярэчнасці паміж імі і складаюць канфлікт, які раскрываецца ў другой кнізе ў форме сутыкнення антаганістычных сацыяльных сіл (выступленне сялян супраць памешчыка

Скірмунта і іх арышт). Па меры разгортвання расказу гістарычныя падзеі, сацыяльна-палітычныя канфлікты становяцца сюжэтаўтваральным момантам. Радасным адчуваннем новага свету прасякнуты лірычны ўступ, які адкрывае другую частку: «На прастор, на шырокі прастор!..» [7].

Асноўныя прынцыпы раскрыцця характару ў Коласа ўзыходзяць да талстоўскай традыцыі, адпавядаючы імкненню шматграннага паказу чалавека. Пейзаж узмацняе драматызм дзеяння, душэўны настрой дзеючай асобы. Так, апісаннем зімовай завірухі пісьменнік адцяняе ўнутраную барацьбу, якая адбываецца ў душы Лабановіча ў сувязі з наступленнем рэакцыі. Пейзаж не толькі сугучны настрою героя, часам ён кантрастуе з ім. Так, спакойная прыгажосць зеленеючых палескіх прастораў супрацьпастаўлена цяжкаму жыццю сялян беларускай вёскі.

Пейзаж у трылогіі нярэдка лірычны: праз яго аўтар перадае свае пачуцці і адносіны герояў да роднай зямлі. Нярэдка апісанні прыроды зліваюцца тут з аўтарскімі лірычнымі адступленнямі. І як лейтматыў праходзіць праз адступленні думка аб неабходнасці вызначыць дарогу ў жыццё ў адпаведнасці з гістарычнымі шляхамі і лёсам народа. Так, у першай частцы гаворыцца аб шляхах-дарожаньках, па якіх ішлі людзі і на працягу доўгіх вякоў неслі ў сваіх сэрцах крыўду. Ва ўступе да другой часткі заўважаем радаснае адчуванне надыходу змен: «Будзе бура, павінна быць навальніца...» [7, с.189]. І нарэшце ў трэцяй – Колас прадстаўляе тыя новыя шырокія шляхі для народа. А ў самім творы, дзе псіхалогія, мараль, быт складаюць адзінае цэлае, канфлікты індывідуальнай свядомасці падпарадкаваны глыбокім гістарычным і сацыяльным канфліктам.

Па сіле мастацкага паказу беларускага пейзажу празаік набліжаецца да цудоўнага майстра рускага пейзажа І.С. Тургенева. Пейзажныя замалёўкі Коласа вызначаюцца лірычнасцю і эмацыянальнай усхваляванасцю, праз іх праяўляецца глыбокі патрыятызм аўтара. Цяжка назваць другога беларускага пісьменніка, у якога пейзаж атрымліваў бы такую эмацыянальна-лірычную афарбоўку.

У трылогіі па-свойму гучыць і тэма горкаўскіх «Маіх універсітэтаў», тэма вялікай вучобы жыццём, якая заканамерна вяла дэмакратычна настроенага юнака, які глыбока адчуваў сваю кроўную сувязь з народам, з усялякіх раздарожжаў на шырокі і ясны шлях. І нават сама кампазіцыя твора як бы адлюстроўвае гэты вобраз вялікай дарогі, якая імкнецца ў далеч: трапляючы з аднаго месца ў другое, сутыкаючыся з разнастайным акружэннем, пазнаючы адно жыццёвае асяроддзе за другім, герой мужнее ў духоўным развіцці.

У трылогіі з найбольшай сілай праявілася шырыня коласаўскага погляду на рэчаіснасць, адбылося арганічнае зліццё лірыкі, эпасу і драмы, ва ўсёй шырыні выявілася шматграннасць яго стылю, своеасаблівасць апавядальнай манеры, багатай фальклорнымі фарбамі. Спакойная, эпічная апавядальная плынь не выключае, аднак, лірычнай усхваляванасці твора. Наадварот, лірычная замілаванасць і ўзрушанасць аўтара лёсам герояў знайшла адзіна верагодную форму выражэння – лірычнага праз эпічнае. Прычым эпічны і лірычны пачаткі спалучаны даволі тонка, здаецца, нават, у адзіна верагодных прапорцыях. Эпічная шырыня твора дазволіла Я. Коласу намаляваць яркую карціну жыцця беларускага сялянства і вясковай інтэлігенцыі ў пачатку XX ст. Стварыўшы цэлую галерэю яркіх мастацкіх вобразаў, празаік паказаў, што тагачасная інтэлігенцыя не была аднароднай масай, што абвастрэнне класавай барацьбы ўзмацніла дыферэнцыяцыю ў асяроддзі інтэлігенцыі.

Нас кранае драматычны лёс старожкі Ганны, усё жыццё якой – гэта пакуты, зневажанне, цяжкая праца і пастаянны страх за заўтрашні дзень. Яна не толькі павінна была цярпець сацыяльны ўціск, але і здзекі п'яніцы-мужа. Муж біў яе «без усякай прычыны, можа таму, што на свеце жыць нялёгка» [7, с.279]. Ма-

люецца і драматычны лёс Ядвісі, якая вырасла ў сям'і пана падлоўчага, чалавека жорсткага і дэспатычнага. Не раз даводзілася ёй быць сведкай жудасных здзекаў, якія чыніў бацька над маці. Пакутлівае жыццё і смерць маці балюча адазваліся на мяккай натуры Ядвісі, а жорсткасць бацькі нарадзіла ў характары Ядвісі скрытнасць і недаверлівасць у адносінах да людзей. Яшчэ ў дзяцінстве, бачачы жудасныя сцэны праяўлення дэспатызму, Ядвіся пранікліся нянавісцю да прыгнёту і насілля. Аднак вобраз Ядвісі застаўся недасказаным да канца, што надае яму некаторую рамантычнасць і лірызм.

У трылогіі даволі часта пейзаж перарастае ў лірычнае адступленне. Наяўнасць лірычных адступленняў з'яўляецца кампазіцыйнай асаблівасцю трылогіі. Я. Колас не толькі расказвае аб складаных шляхах свайго героя, але і выказвае свае адносіны да падзей. Гэтыя аўтарскія адступленні арганічна зліваюцца з асноўнымі падзеямі трылогіі і не парушаюць цэласнасці твора. Асноўнае, што гучыць у лірычных адступленнях – гэта любоў да роднага краю, замілаванне беларускай прыродай, любоў да народа і вера ў лепшую будучыню.

Вылучым найбольш высокамастацкія лірычныя адступленні:

1. Аб старасвецкіх шляхах Беларусі (кніга першая, раздзел XVI) [7, с. 80]: «Шырокі гасцінец з двума радамі старых бяроз...»;
2. «На прастор, на шырокі прастор!» (кніга другая) [7, с. 189];
3. Уступ да другой часткі трэцяй кнігі («Колісь, яшчэ ў дні юнацтва...») [7, с. 541].

Д.І. Гальмакоў адзначае: «Паэтычнасць» беларускай прозы ўзнікла на глебе выкарыстання форм паэтычнай стылістыкі і абумовіла эмацыянальна ўзвышанае гучанне празаічных твораў, вызначыла іх лірызм, пафаснасць» [5, с.9]. Узвышана-паэтычны характар, эмацыянальнасць, лірычнасць – гэтыя рысы характэрны для стылю прозы Я. Коласа. Празаік лірычна ўсхваляваны і суб'ектыўна настроены мастак, і гэта самым істотным чынам адбіваецца на характары твораў. І ўсё ж, нягледзячы на лірычную ўсхваляванасць, суб'ектыўную зацікаўленасць, Я. Колас належыць да ліку пісьменнікаў аб'ектыўнага складу, якія не падмянялі рэалістычны паказ жыцця выяўленнем у мастацкім творы асабістых эмоцый, адчуванняў, парыванняў душы.

Як бачым, мастацкае майстэрства класіка беларускай літаратуры – вельмі павучальнае для іншых майстроў нацыянальнага слова. Мы раскрылі ролю паэтыкі Я. Коласа ў эпічным адлюстраванні рэчаіснасці і чалавечага характару, характару беларуса. А класічная традыцыя пісьменніка, яго багаты і плённы мастацкі вопыт маюць вялікае значэнне для сучаснай літаратуры, садзейнічаюць больш глыбокаму разуменню законаў эпічнага жанру.

## *ЛІТАРАТУРА*


1. ***Тычына М.А.*** Аляксандр Пушкін і Якуб Колас. Мінск, 1999. – 168 с.
2. ***Жураўлёў В.П.*** У пошуку духоўных ідэалаў. Мінск, 2000. – 191 с.
3. ***Шаладонава Ж.С.*** Фарбы быту і быцця ў паэме Якуба Коласа «Новая зямля». Мінск, 2001. – 104 с.
4. ***Адамовіч А.М.*** Маштабнасць прозы. Мінск, 1972. – 198 с.
5. ***Гальмакоў Д.І.*** Стыль прозы Якуба Коласа. Мінск, 1973. – 224 с.
6. ***Хализев В.Е.*** Драма как род литературы. М., 1986. С. 41.
7. ***Колас Я.*** Збор твораў у 14 т. Т.9. Трылогія «На ростанях». Мінск, 1975. С. 189.



*S U M M A R Y*

*The article deals with the instances of synthesis of epos and lyrics in the autobiographical trilogy by Y. Kolas «At The Crossroads». It proves that the proser gives a new meaning to the notins «lyrical» and «epical».*



*Поступила в редакцию 22.03.2002*